# АСЭНСАВАННЕ ПЕРАМОГІ САВЕЦКАГА НАРОДА Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ СУЧАСНЫМ ГРАМАДСТВАМ

***М. А. Бяспалая,***
*загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства,*
*доктар гістарычных навук, прафесар;*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*

Галоўная ідэя даклада заключаецца ў словах: «…и пусть не думают, что павшие не слышат, когда о них потомки говорят». Але справа ў тым, што́ і як гавораць патомкі. Хіба ж маглі ўявіць тыя, хто дачакаўся 9 мая 1945 г., што праз 70 гадоў іх перамога над фашызмам стане полем бітвы – бітвы ідэй, высноў, заключэнняў, і ў гэтай бітве ветэраны, дажыўшыя да юбілею, будуць змагацца за сваё права на Перамогу, як у апошнім акопе? Сучасныя пакаленні адносна памяці аб вайне прадстаўляюць дзяцей, унукаў і праўнукаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай, у кожнага з іх сваё асабістае ўяўленне аб ёй, і яно можа вельмі значна адрознівацца ад калектыўнай памяці аб вайне, якая даўно ператварылася ў нашу нематэрыяльную спадчыну.

Апошнім часам шмат дыскусій, асабліва на міждзяржаўным узроўні, выклікае асэнсаванне перамогі савецкага народа. Абмеркаванне гэтай праблемы адлюстроўвае відавочны зварот да перагляду як уласна ходу вайны, так і яе вынікаў ды наступстваў, спробу нівеліраваць ролю савецкага народа ў перамозе і інш. Калі ў 2013 г. на сесіі ААН было пастаўлена пытанне аб асуджэнні нацызму, то 54 краіны ўстрымаліся, у тым ліку дзяржавы Еўрасаюза, а ЗША наогул прагаласавалі супраць. А ў маі 1945 г. увесь свет спадзяваўся, што падобнае да перажытага больш не паўторыцца. Аб гэтым было напісана ў Звароце Вярхоўнага галоўнакамандуючага І. В. Сталіна да народа 9 мая 1945 г.: «Вайна завяршылася нашай поўнай перамогай… Пачаўся перыяд мірнага развіцця».

Крытыцы падлягае наша «няправільная» памяць аб вайне і яе трансляцыя, напрыклад, у музеях. Яна адрозніваецца ад «правільнай» тым, што, на думку апанентаў, у нашай памяці быццам бы адсутнічае ўяўленне аб шматлікіх ахвярах савецкага народа, аб людзях, прымусова адпраўленых на працу ў Германію, калабарацыі, перажываннях асобнага чалавека на вайне, трагедыі ваеннапалонных і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Што да апошняга, то, хутчэй за ўсё, гэтую трагедыю замоўчваюць на Захадзе, ва ўсякім выпадку, не звяртаюць увагі на важныя факты. На сённяшні дзень устаноўлена, што на канец 1941 г. у палон трапіла каля 3 млн 350 тыс. салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі, а ўсяго за гады вайны – ад 5,2 млн да 5,7 млн. Да лютага 1942 г. у нямецкіх лагерах загінула прыкладна 2 млн савецкіх ваеннапалонных, а да канца вайны – ад 3,3 млн да 3,9 млн, г. зн. 60 %. Для параўнання: у нямецкім палоне загінула каля 4 % палонных з Заходняй Еўропы. У савецкім палоне знаходзілася 3 млн 777 тыс. нямецкіх салдат і афіцэраў, прычым у 1945 г. здаліся ў палон 2 179 749 чалавек, з іх цягам Берлінскай аперацыі – каля 1 млн 300 тыс. Падчас знаходжання ў палоне загінула 14,9 % нямецкіх ваеннаслужачых. Аналіз гэтых лічбаў дае досыць выразную карціну: байцы і камандзіры Чырвонай Арміі ў большасці выпадкаў здаваліся ў палон у першапачатковы перыяд вайны, у бязвыхадней сітуацыі, у абставінах аператыўнай неразбярыхі, бязладнага адступлення, панікі і г. д. Немцы здаваліся ў палон у канцы вайны. На Нюрнбергскім працэсе стаўленне да савецкіх ваеннапалонных ацэнена як злачынства супраць чалавечнасці.

Магчыма, «заходні рацыяналізм» не дазваляе зразумець глыбінныя вытокі перамогі савецкага народа і ўспрыманне апошняй нашчадкамі пераможцаў. На Захадзе могуць дазволіць сабе разважаць аб станоўчых эканамічных наступствах, напрыклад, для вінаробчай галіны Францыі пасля яе акупацыі нямецкімі войскамі, расказваць аб высокай культуры нямецкіх салдат і афіцэраў, у адрозненне ад «рускіх варвараў», ці абурацца недальнабачнасцю жыхароў берагавых раёнаў Англіі, якія загадзя не паклапаціліся аб эвакуацыі, і г. д.

У гістарыяграфіі ЗША і Заходняй Еўропы з'явіліся і тыражуюцца шматлікія навуковыя канцэпцыі: таталітарная, тэорыя вырашальных бітваў, тэорыя пралікаў і страчаных магчымасцей, прэвентыўнай вайны, германацэнтрызму. Звернем увагу на канцэпцыю другараднай ролі СССР у разгроме нацысцкай Германіі, хаця на лета 1944 г. Чырвоная Армія поўнасцю знішчыла 370 нямецкіх дывізій – больш за 73 % агульнай колькасці, ¾ страт тэхнікі вермахт панёс на савецкім фронце. У з'яўленні падобных падыходаў няма нічога дзіўнага, калі прыняць да ўвагі, што ў Цэнтры па вывучэнні ваеннай гісторыі пры арміі ЗША працавала 150 былых генералаў і афіцэраў Генеральнага

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

штаба нацысцкай Германіі на чале з былым начальнікам генштаба сухапутных сіл вермахта – Ф.Гальдэрам.

Па сённяшні дзень, як адзначаюць даследчыкі гэтага пытання ў гістарыяграфіі ЗША і Заходняй Еўропы, не дадзена аб’ектыўная ацэнка злачынстваў нямецкіх акупантаў у дачыненні не толькі да яўрэйскага, але да і славянскага мірнага насельніцтва, адсутнічаюць працы комплекснага характару аб нацысцкай палітыцы ў адносінах да дзяцей, ролі нацысцкай прапаганды і інш. Не распрацаваны праблемы супраціўлення савецкіх ваеннапалонных у нацысцкіх лагерах, пераходу ўдзельнікаў т. зв. «усходніх фарміраванняў» на савецкі бок і інш. Большасць прац па праблемах партызанскага руху грунтуецца на нямецкіх крыніцах, а падпольны рух не з’яўляецца прадметам вывучэння.

Адсутнічае навуковае абгрунтаванне прычын адрознення вядзення вайны ў Заходняй Еўропе і на тэрыторыі СССР. Не звяртаецца ўвага на розныя падыходы да вядзення баявых дзеянняў на Заходнім і Усходнім франтах, розны змест акупацыйных рэжымаў, актыўнае супрацоўніцтва калабарацыянісцкіх рэжымаў у краінах Захаду з фашысцкай Германіяй. У іх разгарнулася вярбоўка добраахвотнікаў для ўдзелу ў баявых дзеяннях на Усходнім фронце, каб стварыць уражанне «крыжовага паходу Еўропы супраць бальшавізму». У выніку ў складзе войск СС супраць савецкіх войск ваявала каля 10 тыс. галандцаў, датчан, нарвежцаў, у складзе вермахта – каля 3 тыс. французаў. Заходнія краіны ўтрымлівалі за свой кошт акупацыйныя нямецкія войскі, агульная сума склала 84 млрд нямецкіх марак. Акрамя гэтага на прадпрыемствы Германіі пастаўлялася харчаванне, каменны вугаль, жалезная руда, чугун, сталь, марганец, цынк, медзь, каляровыя металы, рабочая сіла. Даследчыкі лічаць, што без падтрымкі калабарацыянісцкіх рэжымаў фашысцкая Германія не змагла б прадаўжаць вайну пасля разгрому пад Сталінградам.

Стала аксіёмай тлумачэнне перамогі савецкага народа ўмовамі рускай зімы, дзеяннямі заградатрадаў, існаваннем штрафных рот, вядзення баявых дзеянняў па прынцыпе «пушачнага мяса» і інш. Існаванне падобных з’яў адмаўляць нельга, аб гэтым напісана ў шматлікіх салідных навуковых выданнях, а таксама і ў так званай лейтэнанцкай прозе. Нагадаем, што ў творах В. Быкава, А. Адамовіча, Д. Граніна, Б. Васільева, у кінастужках па матывах іх твораў і іншых адлюстравана

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўспрыняцце вайны праз пачуцці, паводзіны чалавека. Атрымалася так, што мастацкія вобразы пачалі ўспрымацца як сапраўдныя сведчанні аб вайне. Аднак калектыўная праўда аб вайне больш спрошчаная, без псіхалагічных падрабязнасцей, таму што аб'ядноўвае праўду ўсяго народа.

Пасля перамогі ў Вялікай Айчыннай духоўны ўздым у грамадстве быў настолькі відавочны, што ў першыя пасляваенныя гады не было патрэбы ў захаванні памяці аб вайне. Фактычна ўсё насельніцтва СССР з'яўлялася ўдзельнікам вайны, былыя франтавікі і партызаны займалі кіруючыя пасады розных узроўняў, камандуючы склад арміі, студэнты, нават школьнікі – усе ў рознай ступені з'яўляліся ўдзельнікамі вайны.

Актуалізацыю ваеннай тэматыкі, фарміраванне патрыятычнага ўспрыняцця перамогі савецкага народа можна аднесці да 1960–1970 гг., калі стала відавочнай змена пакаленняў. У гэты перыяд узнікае афіцыйны рытуал, звязаны з засваеннем і трансляцыяй ідэалагічнага сэнсу вайны і перамогі, з апраўданнем ахвяр. Менавіта ў гэтыя гады з'явіліся такія формы выхаваўчай працы, як «хвіліна маўчання», «урокі мужнасці», прыняцце воінскай прысягі, прыём у піянеры і шмат інш. з запрашэннем ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны ў якасці ганаровых гасцей, сустрэчы моладзі з ветэранамі, арганізацыя патрыятычных клубаў, гурткоў, «зорных паходаў» і г. д. Ствараюцца грандыёзныя помнікі: «Вечны агонь», «Магіла невядомага салдата», мемарыяльныя комплексы «Курган славы», «Хатынь». Своеасаблівым апафеозам духоўнага ўздыму і патрыятычных настрояў стала масавае шэсце ветэранаў Вялікай Айчыннай 3 ліпеня 1974 г. па галоўным праспекце Мінска. Такое адзінства людзей, іх душэўны парыў уявіць складана, аднак ён атрымаў увасабленне ў гэты дзень і суправаджаўся каласальным выбухам станоўчых эмоцый.

Маральны ўздым, што спадарожнічаў справядлівай барацьбе за сваю сям'ю, яе спакой і жыццё, за вялікую і малую радзіму, склаў той падмурак, на якім фарміравалася агульная перамога. Як жа захоўваецца і транслюіруецца памяць аб ёй у сучаснай, няпростай, сацыякультурнай сітуацыі? Даследчыкі гэтага пытання сцвярджаюць, што ўжо ў гады вайны было ўстаноўлена 44 помнікі яе ахвярам і героям. На тэрыторыі Беларусі да 1990 г. узведзена 8 808 помнікаў ваеннаслужачым, удзельнікам партызанскай і падпольнай барацьбы, ахвярам фашысцкага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

генацыду. Большасць з іх была адкрыта пры актыўным удзеле грамадскіх арганізацый, якія ажыццяўлялі пошукавыя акцыі «Цытадэль мужнасці», «Вызваленне», «Перамога» і г. д. На сучасным этапе аб'ядноўваючую ролю ў арганізацыі і правядзенні пошуку няўлічаных воінскіх пахаванняў, ва ўстанаўленні асоб загінуўшых выконвае дзяржава праз Упраўленне па ўвекавечванні памяці загінуўшых абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. У аўтаматызаваным банку даных «Кніга памяці» ўтрымліваецца інфармацыя аб 6 242 пахаваннях, што налічваюць 2 195 182 чалавекі. У сувязі з тым, што, паводле афіцыйных даных, у Беларусі загінула 2 596 676 чалавек, пошук прадаўжаецца.

Галоўным акумулюючым асяродкам памяці аб вайне з'яўляюцца музеі. Аднак яны павінны ўлічваць, што змяніўся кантынгент наведвальнікаў, іх інтэлектуальны ўзровень і методыка засваення новых ведаў, матывацыя набыцця апошніх. У значнай ступені гэта абумовіла пераход ад традыцыйнай арганізацыі экспазіцыйнай прасторы да перамяшчэння ў цэнтр увагі асобы наведвальніка і ўключэння яго ў музейную дзею. Для сучасных школьнікаў, студэнтаў, якія складаюць асноўную частку арганізаваных наведвальнікаў, удзел у інтэрактыўных ці тэатралізаваных формах засваення інфармацыі з'яўляецца арганічным, зразумелым і пажаданым. Стваральнікі новай экспазіцыі Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, мяркуючы па ўсім, улічылі адзначаную тэндэнцыю і прапанавалі сваю канцэпцыю арганізацыі музейнай прасторы з выкарыстаннем разнастайных інтэрактыўных тэхналогій, максімальна рэалістычных інсталяцый, выразных дыярам, прадметаў, што маюць цікавую гісторыю.

Аднак крытыкі новай экспазіцыі згаданага музея звяртаюць увагу на тое, што ў іншых постсавецкіх краінах адрадзілася нацыянальная памяць. Мэтай яе з'яўляецца аб'яднанне грамадства, а зместам – вызваленне ад навязанай правячымі вярхамі Савецкага Саюза афіцыйнай памяці аб вайне, што набліжае яе да агульнаеўрапейскай культуры памяці аб Другой сусветнай. Можна палічыць за ўзоры такой памяці культываемае ў ЗША сцвярджэнне, што вайну распачалі немцы, пацярпелі яўрэі, а выйгралі ЗША, ці разуменне, што падчас дзеяння Украінскага фронту на ім ваявалі толькі ўкраінцы, і г. д.

Неафіцыйным адказам на падобныя заключэнні аб «няправільнасці» нашай памяці аб вайне, аб прысутнасці ў ёй афі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыйнай лініі з’яўляецца новая, нікім не санкцыянуемая акцыя «Бессмяротны полк», што ўзнікла па ініцыятыве нашых сучаснікаў. У 2013 г. некалькі дзясяткаў жыхароў сібірскага Омска вышлі 9 мая на дэманстрацыю з партрэтамі сваіх блізкіх – удзельнікаў вайны, а 9 мая 2014 г. падобныя шэсці, ужо шматтысячныя, прайшлі ў многіх гарадах Расіі. Гэтая ініцыятыва набыла новую форму праз стварэнне вэб-сайта «Бессмяротны полк», старонкі якога бесперапынна папаўняюцца. Свае «бессмяротныя» ўзводы і роты ёсць у кожным калектыве. Сярод нас у свой час працавалі былыя ўдзельнікі вайны: юнга Б. І. Бранавіцкі, франтавікі І. К. Бяка, І. Р. Захараў, Н. Ф. Федзюкова, партызаны В. М. Пузікаў і М. М. Грынчык і інш. Іх штодзённы подзвіг на вайне набліжаў Перамогу, а іх памяць аб тых гадах дапамагала асэнсоўваць перамогу ўсяго савецкага народа ў Вялікай Айчыннай.

*1.* Военнопленные иностранные в СССР. Военнопленные советские в Германии / Великая Отечественная война: Энциклопедия. – М. : ОЛМА Медиа Групп, 2010. – С. 143–148.

*2.* Коллаборационизм в оккупированных странах Европы // Великая Отечественная война: Энциклопедия. – М. : ОЛМА Медиа Групп, 2010. – С. 286–293.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВЕЛИЧИЕ ПОДВИГА НАРОДА И УРОКИ ИСТОРИИ

***П. И. Бондарь,***
*профессор кафедры культурологии,*
*доктор исторических наук, профессор;*
*Белорусский государственный университет*
*культуры и искусств*

Подвиг в нашем сознании ассоциируется с героическими поступками человека во славу Родины. Бесспорный духовно-ценностный смысл этого феномена – в самоотверженности и легендарности, геройской инициативе и свободном выборе поведения в критических обстоятельствах объективной необходимости. В его основе – идейная убежденность, действенный патриотизм, приоритет общих интересов, пренебрежение обывательским благоразумием.

В жизни всегда есть место подвигу. И совершают его личности, жертвующие частным благополучием, почин и действия